Падтрымай "Вясну" на PATREON

Блогер MozgON атрымаў 15 сутак за заклікі да акцыі каля “Белнафтахіму”

18.03.2020 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, пераслед, свабода мірных сходаў



Уладзімір Цыгановіч

Блогер Уладзімір Цыгановіч, які вядзе youtube-канал MozgOn, завочна быў асуджаны на 15 сутак арышту за заклікі ў інтэрнэце да ўдзелу ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве.

Гутарка ідзе пра сустрэчу-мітынг каля будынку “Белнафтахіму” у Мінску, якая прайшла 25 лютага. Напярэдадні **Уладзімір Цыгановіч** заклікаў прыйсці туды ўсіх, каго непакоіць пастаяннае павышэнне коштаў на паліва, і задаць пытанні на гэты конт кіраўніцтву канцэрна, што ў выніку атрымалася. На сустрэчу прыйшло некалькі дзясяткаў чалавек.

Як стала вядома праваабаронцам, неўзабаве блогер атрымаў пратакол па ч. 3 арт. 23.34 КаАП. Яго абвінавачвалі ў тым, што ён 24 лютага ў сваім тэлеграм-канале заклікаў людзей прыйсці да “Белнафтахіму” без дазволу Мінгарвыканкаму. Суд па гэтай справе прызначылі на 12 сакавіка.



место работы (учебы) Республика Беларусь должность
(наименование организации (учреждения образования))

гражданство образование

ранее привлекавший(ая)ся к административной ответственности см. ВВД
(когда и за что привлекался(ась))

совершил(а) правонарушение
(дата, время, место и обстоятельства совершенного правонарушения)

Цыганович В.В., будучи 05.12.2019 подвергнутым административному взысканию по ч.1 ст.23.34 КоАП, в нарушение ч.2 ст.8 Закона Республики Беларусь "О массовых мероприятиях в Республике Беларусь", 24.02.2020 в 09.40 часов, находясь в неустановленном месте, разместил в сети Интернет в мессенджере «Telegram» в открытом канале «MozgonBelarus» информацию о дате, времени и месте проведения массового мероприятия – собрания, до получения разрешения Мингорисполкома на его проведение, а именно о встрече 25 февраля в 14.00 часов напротив входа в концерн «Белнефтехим» по адресу: г.Минск, пр.Дзержинского, 73, с целью коллективного обсуждения ценообразования на автомобильное топливо и собирания подписей для обращения по вопросам об изменении законодательства, чем допустил публичный призыв к организации и проведению собрания с нарушением установленного порядка его организации и проведения, при отсутствии в этих деяниях состава преступления.

ответственность, за которое предусмотрена 2 3 ст. 23 34 КоАП Республики Беларусь
(часть, статья, наименование нормативного правового акта)

Лицо, в отношении которого ведется административный процесс: права и обязанности, предусмотренные ст. 4 ПИКоАП Республики Беларусь, разъяснены.

Подпись Уладзімір Цыгановіч

Потерпевший(ая):

Фамилия Имя Отчество

адрес места жительства (пребывания)

Калі паплечнікі Уладзіміра прыйшлі ў суд Маскоўскага раёна Мінска, дзе мусіў адбыцца разгляд справы, то даведаліся, што на той дзень былі прызначаны ажно два адміністрацыйныя працэсы ў дачыненні да блогера. Прычым адзін, які вяла суддзя **Таццяна Мотыль**, ужо скончыўся. Як удакладніў “Вясне” аўтар каналу “ДримДим”, першы суд хутчэй за ўсё датычыўся заклікаў да іншай акцыі – на МКАД. Але вынікі гэтага суда пакуль засталіся невядомымі.

Другі суд – за “Белнафтахім” – прайшоў вельмі хутка. Суддзя **Лідзія Целіца** вынесла рашэнне пакараць Уладзіміра Цыгановіча арыштам на 15 сутак. Тэрмін арышту будзе лічыцца з моманту затрымання.

Такім чынам пераслед блогераў за ўдзел ці асвятленне мірных сходаў у Беларусі працягваецца. Нагадаем, што ў снежні 2019 года і ў студзені 2020-га шэраг блогераў атрымалі штрафы і суткі за ўдзел у снежаньскіх акцыях пратэсту супраць інтэграцыі з Расіяй. Напрыклад, блогер **Сяргей Ціханоўскі** ("Краіна для жыцця") агулам атрымаў 30 сутак арышту, а **Зміцер Казлоў** ("Шэры кот") – рэкордныя 120 сутак па выніках васьмі судоў.

Навіны ад Spring96.org у Telegram. Падпішыся на наш канал https://t.me/viasna96

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY